# ГУМАНІСТЫЧНЫЯ І НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ІДЭАЛЫ ПРОЗЫ У.КАРАТКЕВІЧА

М.С.Малчанава

У.Караткевіч - адзін з найбольш яскравых пісьменнікаў беларускай літаратуры XX стагоддзя. На старонках яго цудоўных кніг мы сустракаем герояў, горача улюбленых у свой край і яго прыроду, людзей, якія з гонарам носяць імя беларусаў. Падобным на сваіх герояў быў і сам пісьменнік, які пісаў пра беларусаў і аб Беларусі. Пісаў у той час, калі лічылі, што залішняе захапленне беларускім, г.зн. - нацыянальным - гэта нібыта праяўленне нацыяналізму. І гэта ў той час, калі на першае месца ставілася такое паняцце, як савецкае, як быццам другое магло перакрэсліваць першае.

Асаблівую каштоўнасць многім творам У.Караткевіча прыдаюць такія іх рысы, як яскрава выражаная нацыянальная самабытнасць і цудоўная, сакавітая, інакш кажучы, сапраўдная беларуская мова.

Нездарма кажучы, многія прыхільнікі пісьменніка лічаць, што чытаць творы У.Караткевіча ў перакладзе - гэта марная трата часу, бо імкненні творцы, яго душа і яго ідэалы праяўляюцца не толькі ў тым, пра што ён піша, але і ў тым, як ён аб гэтым піша, да якіх выразных моўных і мастацкіх сродкаў ён прыбягае. Трэба таксама адзначыць, што яго творы сведчаць аб вельмі высокай адукаванасці мастака не толькі як мовазнаўцы, але і як гісторыка. Ён грунтоўна ведаў гісторыю старажытнай славянскай (у тым ліку і беларускай) і рэлігійнай культуры. У такіх кнігах, як "Каласы пад сярпом тваім", "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", "Чорны замак Альшанскі", "Дзікае паляванне караля Стаха" і інш. мы знаходзім шмат таму прыкладаў.

Характэрнай асаблівасцю творчасці беларускага пісьменніка з'яўляецца тое, што ў сваіх вершах, драмах і аповесцях ён апісвае не адзін нейкі гістарычны перыяд, а спрабуе аналізаваць самыя розныя пласты народнага жыцця, ад эпохі сярэдніх вякоў да падзей нашага часу. Так у адным з лепшых і складаных твораў У.Караткевіча "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" пісьменнік ства-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рае маляўнічую, каларытную і шматлікую карціну жыцця Белай Русі ў пачатку XVI стагоддзя. У гэтай кнізе пісьменнік неардынарна намаляваў далекае прошлае зямлі сваіх продкаў. Прыгодніцкі сюжэт аповесці мастак напоўніў сацыяльна-філасофскім і псіхалагічным зместам, шырока выкарыстоўваючы адрыўкі з летапісаў і хронік, прымаўкі, прыказкі, цытаты з Бібліі і Евангелляў.

Нездарма некаторыя літаратуразнаўцы параўноўваюць аповесць-прытчу "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" (так акрэсліваюць жанр аповесці) з такімі дабыткамі сусветнай літаратуры, як "Гарганцюа і Пантагруэль" Ф.Рабле і "Кола Бруньён" Р.Ралана. На мой погляд, спіс такіх твораў можна пашырыць і назваць сярод іх "Дэкамерон" Бакачча, "Паўстанне анелаў" А.Франса, ці нават "Майстра і Маргарыту" М.Булгакава. Набліжае гэтыя творы ў першую чаргу высокае майстэрства іх творцаў і іх антыклерыкальная накіраванасць, бязлітаснае, саркастычнае аблічэнне каталіцкага і праваслаўнага духавенства. Ужо з першых старонак аповесці У.Караткевіча "Хрыстос прызямліўся ў Гародні" яе аўтар абвінавачвае прадстаўнікоў царквы ў жорсткай, бязлітаснай барацьбе супраць гуманізму і гуманістаў эпохі Адраджэння, якія марылі аслабаніць людзей ад фанатызму царквы.

"Цемныя і брудныя, нават фізічна, - піша У.Караткевіч, - яны не думалі, што плаванне Калумба і выданне Скарынай Бібліі на зразумелай мове і ёсць два ўдары з серыі смяротных, якія наносіць іхняй догме новы Чалавек".

Далей ён піша, што нельга іх лічыць свядомымі воінамі цемры. Яны былі проста людзьмі, якія баранілі свой "веліч" і сваю уладу, свой мяккі кавалак.

Трэба адзначыць, што многія філосафы, паэты і пісьменнікі свету выкрывалі ў сваіх творах злачынствы царкоўнікаў супраць людзей і самых прынцыпаў хрысціянскай рэлігіі, выкарыстоўваючы веру людзей у бога на карысць сабе. Царква заўсёды абараняла інтарэсы тых, у чыіх руках была ўлада, моц і золата. Так думалі і аб гэтым пісалі Данте, Бакачча, Вальтэр, Дзідро, Русо, Мальер, Гётэ, Гюго, Мэрымэ, Талстой, Дастаеўскі і шмат іншых. Нельга сказаць, што яны не верылі ў існаванне бога (кожны з іх усведамляў яго па-свойму), але ўсе яны не верылі ў святасць "Святых айцоў", якія, прыкрываючыся імем бога, рабілі сваю чорную справу на зямлі, ператвараючы жыццё веруючых у пекла. Дастат-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кова успомніць жудасныя справы Інквізіцыі.

Аб катаваннях доказнай Інквізіцыі, аб грахах (мякка кажучы) духавенства піша у сваей аповесці "Хрыстос прызямліўся у Гародні" з вялізным абурэннем і гневам У.Караткевіч. Але ёсць у яго творы адзін цікавы момант, на які амаль не звяртаюць увагі крытыкі. Гэта пытанне аб тым, кім жа на самой справе з'яўляецца Брась Братчык, які выдае сябе за прайдзісвета і махляра, за вандруючага камедыянта, у прошлым - школяра з Міру, выгнанага з калегіума за ерась. Але у аповесці ёсць шмат такіх эпізодаў, якія сведчаць аб тым, што магчыма Юрась Братчык - прышэлец з космасу, пасланы на зямлю з нейкай добразычлівай місіяй. Неяк ён абмовіўся, што год трыста таму назад, магчыма, - дабавіў ён, людзям на зямлі жылося лягчэй. Сімвалічна і сама назва аповесці - "Хрыстос прызямліўся у Гародні", а не "прышэсце Хрыста"; і нейкую зорку ноччу шукаў ён у небе, куды ён не мог звярнуцца, бо, відаць, яго карабель разбіўся у час пасадкі і знайшлі яго у тым месцы, дзе упаў, як здалося несвядомым, цемным людзям, "вогнены змей". Ролю Ілжэ-Хрыста яго прымусілі выканаць царкоўнікі, каб спасціся ад паўстання простага люду у цяжкі галодны год.

Так іншапланецянін ператварыўся у мужыцкага Хрыста, які хацеў дапамагчы людзям. Чаму У.Караткевіч пісаў аб касмічным паходжанні "Хрыста" у іншаказальнай форме - зразумела, бо у гэты час гэта тэма была забаронена, як крамольная. Відаць, пісьменнік быў пад уплывам філолага-славіста В.Зайцава з яго тэорыяй "касмічнага паходжання бога". Ён напісаў кнігу "Богі прыходзяць з космасу" - 1967 г., якая была забаронена, а сам вучоны быў абвяўлены "дысідентам і касмапалітам". А вось тэма "антыклерыкальная" была дазволена - як усе змяняе час! Але у сваей кнізе У.Караткевіч выкрывае не толькі царкву, але і прадстаўнікоў свецкай улады. І яго крытыка накіравана супраць уладароў не толькі прошлых часоў, але і супраць тых, хто карыстаецца уладай у сваіх асабістых мэтах і у сучасным жыцці.

Зразумела, чаму такім складаным быў пісьменніцкі лес гэтага таленавітага беларускага мастака.